МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

4 мая 2018 г. № 18 (451)



стар. 2

**Ці стане нерухомасць... магнітам?**



стар. 14

**Феномен па-слаўгарадску**



стар. 15

**Для аматараў скваркі... і не толькі**

ТЭМА ТЫДНЯ

# РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Свята-Петра-Паўлаўскі храм-помнік у в. Лясная Слаўгарадскага раёна.

**Н А ДЭПУТАТАЎ мясцовых Саветаў сёння ўскладаюцца вялікія спадзяванні, неабходна, каб іх роля і значнасць у грамадстве адчувальна павысіліся і ўзмацніліся. Яны павінны быць бясспрэчнымі лідарамі і аўтарытэтамі. З такім пасылам звярнуўся да народных абраннікаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Слаўгарадзе.**

Тэмай размовы стала павышэнне ролі органаў мясцовага самакіравання ў рашэнні актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця. У Слаўгарад былі запрошаны старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Удзел у пасяджэнні прынялі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна Кананчук. Разам з дэпутатамі парламента ў Слаўгарад прыехалі прадстаўнікі міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў. Аналагічныя пасяджэнні ў будучыні пройдуць для дэпутатаў Мінскай і Віцебскай абласцей, а потым — Гродзенскай і Брэсцкай.

стар. 4

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# ВАДА ПАВІННА БЫЦЬ СМАЧНАЯ

**Якую ваду спажываюць у Мінскай вобласці і ці можна яе ўжываць з-пад крана і з вясковых калодзежаў?**

— Інфармацыю па якасці вады ў Мінскай вобласці мы пастаянна аналізуем, таму маем уяўленне пра тое, якая яна ў цэнтральным рэгіёне, і пра тыя праблемы, што існуюць. Мы іх бачым як па выніках праверак, так і праз лабараторны кантроль, які дазваляе выявіць слабыя месцы ў пытаннях водазабеспячэння насельніцтва, — расказвае **загадчыца аддзелам гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына МІЛАНОВІЧ.** — Каб сітуацыя была больш зразумелая, дадам, што ёсць цэнтралізаванае забеспячэнне вадой — камунальнае, якое эксплуатуюць службы ЖКГ, і ведамаснае. Праўда, апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да змяншэння долі ведамаснага, паколькі сельскія сеткі паступова перадаюцца ў камунальную ўласнасць. Водазабеспячэнне, асабліва ў сельскай мясцовасці, прадстаўлена таксама нецэнтралізаванымі крыніцамі (калодзежы: грамадскія і індывідуальныя).

Генеральная асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на міжнародным узроўні абвясціла 2005—2015 гады дзесяцігоддзем бяспечнай вады. І наша краіна на працягу гэтага перыяду паэтапна рэалізоўвала Дзяржпраграму «Чыстая вада», якая знайшла свой працяг у Дзяржпраграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады» — з распрацоўкай комплексу мерапрыемстваў па паляпшэнні сетак водазабеспячэння, замене няспраўных, будаўніцтве новых, уладкаванні станцый абезжалезвання і водазабораў з улікам ваданосных гарызонтаў. Акрамя гэтага, зараз Беларусь удзельнічае ў такой праграме, як рэалізацыя Мэт устойлівага развіцця, адна з якіх — забеспячэнне якаснай вадой.



— Вада, як і любы прадукт, можа быць менш або больш смачнай. Вада з падземных крыніц адрозніваецца прыемнымі смакавымі якасцямі і мікрабіялагічнай чысцінёй. Між тым гідралагічная асаблівасць беларускай вады — павышанае ўтрыманне жалеза ў свідравінах. Але за час рэалізацыі праграмы «Чыстая вада» ў Мінскай вобласці скарацілася ўдзельная вага нестандартных проб па колькасці жалеза з цэнтралізаваных сетак. Па выніках мінулага года яна склала 15,7 % супраць 28,7 % у 2005 годзе (і гэта пры тым, што ў прыродных крыніцах удзельная вага засталася на ўзроўні плюс-мінус 40 %). Паўплываць на якасць прыроднай вады, якая праходзіць усе воданапорныя слаі і прыносіць з сабой хімічныя элементы, што ўтрымліваюцца ў горнай пародзе, немагчыма. Перавышэнне па прыродным жалезе рознае ў розных рэгіёнах Міншчыны. Напрыклад, у Капыльскім, Любанскім, Пухавіцкім, Бярэзінскім раёнах удзельная вага нестандартных проб перавышае сярэдні абласны паказчык. У некаторых выпадках, калі прыроднае перавышэнне значнае і ў пэўны момант нельга карэнным чынам паўплываць на сітуацыю, райвыканкамы прымаюць часовыя нарматывы — не больш за адзінку. Гэта дапускаецца заканадаўствам.

стар. 3